# Дарогамі памяці

*Вашкоў Уладзіслаў*, студэнт групы 10601218, ЭФ
Кіраўнік доктар гіст. навук, прафесар *Л.М. Сямёнава*

Памятныя дні вайны… Якія яны для тых, хто яе перажыў? Яшчэ ў школьным узросце я задумаўся над гэтым пытаннем. І не выпадкова. Пачалося ўсё з таго, што я разам са сваімі аднакласнікамі пайшоў на прагляд кінастужкі “Брэсцкая крэпасць”. Праўда, раней чуў ад хлапчукоў, што фільм цікавы, але не мог і падумаць, што буду так уражаны. Седзячы ў кіназале, я ўважліва ўглядаўся на экран.

Духавы аркестр іграў вальс у гарадскім парку. Невялічкі хлопчык, твар якога быў абсыпаны канапушкамі, быў адным з галоўных герояў. Далей на экране паказвалі звычайную штодзённую мітусню людзей, няхай сабе і ў Брэсцкай крэпасці.

Але тут ужо пачалі змяняцца падзеі. Пачалася вайна…

Упершыню я ўбачыў, як знянацку разарвалася мірнае жыцце. Колькі разгубленасці, страху і панікі. Толькі невялікая частка людзей змагла ў складанай сітуацыі арганізаваць іншых, спыніць паніку. Так, на пачатак вайны ў Брэсцкай крэпасці было каля 8 тысяч ваенных і членаў іх сем’яў. А супраць іх была накіравана вялікая сіла ворага: авіяцыя, танкі, добра ўзброеныя салдаты. Магчыма, гэта першы фільм, дзе вораг паказаны як вельмі сур’ёзны і моцны праціўнік. Цяжка было яго перамагчы не толькі сілаю, але і псіхалагічна. Калі героі крэпасці выходзілі ў эфір па рацыі, то прасілі дапамогі ад суседніх застаў, якія на той момант былі ўжо ўшчэнт разбітыя. Чакалі, спадзяваліся, што армія вось-вось прыйдзе на дапамогу, а вораг падбіраўся да Мінска…

Звычайна ў іншых кіналентах паказваюць салдат або перад боем, або пасля бою. А вось так, паказаць самае пекла вайны, паказаць разгубленасць чалавека – тое ўпершыню. А мне, паверце, зусім не сорамна за тых хлопцаў, што бегалі пад шчыльным прыцэлам авіяцыйных бомбаў. Невядома, як бы мы сябе павялі ў такіх абставінах. Сядзець у цёплым пакоі і разважаць аб гераізме – гэта зусім не тое, што зірнуць смерці ў вочы. Як важна, што ацаніўшы сітуацыю, рэальна ўбачыўшы магутнасць ворага, Савецкі Салдат вырашыў выступіць супраць нямецкага акупанта. Толькі зараз мне стала зра-

зумела, з якім сур'ёзным праціўнікам прыйшлося змагацца нашым суайчыннікам.

Пасля заканчэння кіно з залы ўсе выходзілі ціха, быццам баяліся расплёскаць нешта вельмі дарагое і шчымлівае, што так непрыкметна напоўніла душы, свядомасць, думкі…

У маей вёсцы Верасніца ёсць помнік загінуўшым воінам. На бетонных плітах напісаны сто чатырнаццаць імёнаў землякоў, якія аддалі жыццё за Радзіму ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Сярод іх ёсць адзінаццаць чалавек з аднолькавым са мной прозвішчам – Вашкоў. Я пацікавіўся ў майго бацькі, ці не з'яўляецца нехта з іх нашым родзічам. Яго адказ мяне прывёў у жах. Аказваецца, што Васіль, Дзмітрый, Максім і Трафім, чые імёны ёсць на помніку, былі роднымі братамі майго прадзядулі Вашкова Архіпа Рыгоравіча. На вайну пайшлі ваяваць усе шэсць братоў. Чатыры загінулі, і толькі Архіпу і Еўдакіму давялося вярнуцца жывымі дадому.

Мой прадзед, Вашкоў Архіп Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1906 годзе ў вёсцы Верасніца Тураўскага раёна Палескай вобласці. У сям'і было восем чалавек: бацькі і шасцёра хлапчукоў. Жылі яны не вельмі бедна да вайны. Мелі сваю гаспадарку: карову, свіней, курэй. На полі ў іх было дваццаць сотак зямлі. Там садзілі бульбу, пшаніцу, ячмень. З мукі пяклі булкі толькі на свята. Ячменем кармілі курэй. Бацькі ў асноўным працавалі на зямлі, а сыны ва ўсім ім дапамагалі. Архіп жаніўся ў 22 гады, таму да вайны ў яго нарадзіліся тры сыны.

Мой прадзед быў старэйшым сынам ў сваіх бацькоў. Архіп пайшоў ваяваць з першых дзён вайны. Спачатку змагаўся з ворагам у складзе партызанскай брыгады "Савецкая Беларусія", потым ў Польшчы, пазней дайшоў да самага Берліна.

У красавіку 1945 года дывізія, у складзе якой змагаўся Архіп, заняла прадмесце Берліна. Прадмесце было пустым. Усё грамадзянскае насельніцтва сагналі на будаўніцтва ўмацаванняў у Берлін. Чырвонаармейцы разумелі, што да перамогі рукой падаць. Таму кожны салдат з патроенай энергіяй змагаўся з ворагам. Але і вораг быў асабліва небяспечны. Сем дзён і начэй не сціхалі гарматы, мінамёты, кулямёты. Мора агню абрынулася на фашыстаў. Магутны кідок дывізіі, у якой галоўную ролю адыгралі танкі, прымусіў ворагаў адысці на апошні рубеж абароны. Даводзілася браць з жорсткім боем кожны дом, кожны паверх, кожны метр зямлі. Танкі ў Берлін не ўвайшлі: занадта вузкія былі вуліцы. Таму асноўны ця-

жар па ўзяцці горада ўпаў на гарматныя і мінамётныя батарэі. Мінамётная батарэя Архіпа Вашкова размяшчалася ў двары нейкага вялікага змрочнага дома, што стаяў каля ракі Шпрэе. Прадукты харчавання і боепрыпасы даводзілася салдатам дастаўляць адзін аднаму па дроце, працягнутым на вышыні чалавечага росту, таму што вуліца моцна прастрэльвалася. Салдаты працягвалі змагацца да пачатку мая. У адной з перастрэлак Архіп быў паранены ў грудзі. Ён упаў, страціў прытомнасць. Ачнуўся і ўбачыў над сабой свайго таварыша, які сяк-так перавязаў яго грудзі. Яны працягвалі змагацца, не сыходзячы з пярэдняга краю да таго часу, пакуль не было абвешчана аб капітуляцыі гітлераўскага камандавання. Гэта было ўжо другога мая. Дзень сустрэў салдат нязвыклай цішынёй. Гарнізон Берлін капітуліраваў. Радасці пераможцаў не было канца. Усе атрымалі звальненне. Але раненне прадзеда аказалася цяжкім і ён яшчэ доўга лячыўся ў шпіталі. Яго дывізія рушыла далей, да Эльбы. Сёмага мая адбылася сустрэча з саюзнікамі, а ў ноч з восьмага на дзвятае мая быў падпісаны акт аб капітуляцыі фашысцкай Германіі.

Пасля вайны Архіп Вашкоў вярнуўся ў родную вёску Верасніца. У 1946 годзе ў яго сям'і нарадзіўся сын Іван, мой дзядуля.

Еўдакім Вашкоў таксама застаўся жывым. Ён быў узнагароджаны ордэнам Славы трэцяй ступені. Пасля вайны працаваў у калгасе кавалём.

Чатыры браты Вашковых: Васіль, Дзмітрый, Максім, Трафім не вярнуліся з гэтай жорсткай вайны. Мой прадзед Архіп не доўга пражыў пасля вайны. Цяжкае раненне падарвала яго здароўе. Ён памёр на пачатку пяцідзясятых гадоў мінулага стагоддзя.

Праходзяць гады. З цягам часу я адчуваю ўнутраную патрэбнасць адзначаць, дакладней, ушаноўваць Дзень Перамогі не па загаду, не таму, што гэта чырвоная дата календара. А проста таму, што я – частка сваёй Радзімы, свайго народа, які здабыў Перамогу вельмі вялікаю цаною. Я падымаю вочы да неба, углядаюся ў блакіт, дзе кружаць срэбнакрылыя буслы. Здаецца, адтуль, з вышыні, пазіраюць на мяне вочы тых, хто загінуў у час вайны. Яны радуюцца таму, што я жыву ў мірны час. А я свята буду памятаць свой абавязак перад імі: захаваць мір на зямлі, зрабіць усё, што ад мяне залежыць, у гэтай справе.